# ГУМАНІСТЫЧНЫЯ ТЭНДЭНЦЫІ Ў НАВУЧАЛЬНА-ВЫХАВАЎЧЫМ ПРАЦЭСЕ ПАЎНОЧНА-АМЕРЫКАНСКІХ ІНДЗЕЙЦАЎ

**В. А. Радзіеўская**

У адказ на змену сацыяльна-эканамічных умоў развіцця чалавецтва, на працэсы глабалізацыі, на ўтварэнне новага тыпу грамадства – інфармацыйнага, змяняюцца і погляды на ролю чалавека ў розных сферах яго дзейнасці. Каб падрыхтаваць прафесійнага спецыяліста, годнага грамадзяніна, шчаслівую гарманічную асобу, паспяховую ў новых умовах, педагогіцы неабходна шукаць найбольш эфектыўныя метады для ажыццяўлення гэтай мэты. У гэтым дачыненні вельмі цікавай з’яўляецца навучальна-выхаваўчая практыка індзейскіх плямёнаў, якая пранесла праз гісторыю гуманістычную скіраванасць і прапанавала шляхі, метады, прыёмы, тэхналогіі, якія могуць вельмі эфектыўна выкарыстоўвацца ў сучаснай педагогіцы па ўсім свеце. У дадзенай працы разглядаюцца метады і падыходы да педагагічнага працэсу менавіта паўночна-амерыканскіх індзейцаў, г.зн., прадстаўнікоў плямёнаў не-еўрапейскага паходжання, продкі якіх жылі на тэрыторыі сучасных ЗША да прыходу белага насельніцтва на кантынент.

Напрацягу сваёй “амерыканскай” гісторыі (з 1776 да сучаснасці) індзейская адукацыйная сістэма, працэс навучання і выхавання спазналі падзенні і ўздымы. Уключэнне навучэнцаў з індзейскіх плямёнаў у агульнанацыянальную амерыканскую адукацыйную сістэму аказалася неэфектыўным – акрамя частковай асіміляцыі насельніцтва, вынікамі такой стандартызацыі сталі недастатковы (калі не вельмі нізкі) узровень адукацыі прадстаўнікоў індзейскай часткі жахыроў ЗША, іх нежаданне дасягаць акадэмічных вышыняў, іх малая колькасць сярод студэнтаў ВНУ, прафесійных спецыялістаў, навукоўцаў, а таксама іх пэўная “культурная маргінальнасць” (праблематычны працэс сама-ідэнтыфікацыі і прыналежнасці да пэўнай культуры). Станоўчым вынікам развіцця адукацыі індзейцаў стала захаванне імі сваёй нацыянальнай або этнічнай культурнай традыцыі ў змесце адукацыі і метадах навучальна-выхаваўчага працэсу. Таму падаецца мэтазгодным прааналізаваць і ўзяць лепшыя ідэі індзейскага працэсу выхавання і навучання для эфектыўнага развіцця педагогікі ўсяго свету.

Вельмі паказальна, што апошнім часам папулярнымі ў сусветнай педагагічнай навуцы сталі ідэі гуманізацыі і гуманітарызацыі адукацыі, навучальна-выхаваўчага працэсу, ідэі, на якіх засноўваўся традыцыйны і якія характэрызуюць сучасны індзейскі падыход да педагагічнага працэсу:

1) гарманічна развітая асоба ва ўсіх яе ўзаемадачыненнях і сферах дзейнасці – галоўная каштоўнасць выхавання і навучання;

2) ажыццяўленне педагагічнага працэсу разглядаецца на аснове гуманістычнага падыходу, асноўнымі накірункамі якога з’яўляюцца: а) індывідуалізацыя выхавання і навучання; б) цэласнасць падыходу да разумення чалавека, што ў сваю чаргу вядзе да стварэння інфармацыйна-сутнаснай, псіхалагічна камфортнай педагагічнай атмасферы, сістэмнасці і цэласнасці прэзентацыі інфармацыі, задзейнічання рацыянальнага і эмацыйнага складнікаў, дасягнення персанальных і акадэмічных мэтаў і інш.); в) дыялагізацыя (навучэнец – актыўны суб’ект педагагічнага працэсу); г) каштоўнасная арыентацыя (засваенне перш за ўсё нацыянальных каштоўнасцяў, а таксама талерантнасць да каштоўнасцяў іншых культур); д) развіццё грамадскасці (успрыняцце сябе прыналежным да супольнасці, навучанне і выхаванне праз сумесную дзейнасць, а таксама бесперарыўнасць педагагічнага працэсу паміж школай і па-за-школьным асяродкам); е) творчасць, самастойнасць, незалежнасць, адказнасць і самаразвіццё; ж) роўнасць усіх суб’ектаў педагагічнага працэса ў магчымасцях атрымання ведаў.

Зразумела, што пералічаныя гуманістычныя тэндэнцыі навучальна-выхаваўчага працэсу не з’яўляюцца выключна індзейскімі. Аднак тое, што звяртае на сябе ўвагу менавіта ў дачыненні да індзейскай традыцыі і

што адрознівае яе ад іншых, гэта – глыбіня разумення важнасці выхавання на аснове павагі да сябе (самасвядомасць), іншай асобы (талерантнасць), наваколля (сацыяльнасць, нацыянальная або супольнасная самасвядомасць), прыроды (экалагічнасць мыслення), Вышэйшай сілы (Бога, Абсалюта, Духа – духоўнасць).

Кажучы пра адметнасць навучальна-выхаваўчага працэсу індзейцаў, акрэсліваюць такія паняцці як:

1) маральнае выхаванне (character education), накіраванае перш за ўсё на фармаванне маральнасці або духоўнасці навучэнцаў на аснове агульначалавечых каштоўнасцяў. У межах гэтага паняцця сцвярджаецца важнасць уласнага досведу пры навучанні, спрыянне кожнай асобай гарманічнаму сацыяльна-эканамічнаму развіццю супольнасці, талерантнасць да розных культурных традыцый, цэласны падыход да ўдасканалення здароўя і духоўнасці, першаснае значэнне супольнасці, самаразвіццё і дысцыпліна.

2) цэласнае (“халістычнае”) навучанне (holistic teaching/learning), якое разглядаецца як шматузроўневы падыход, што вядзе да адначасовага разумення многіх аспектаў пэўнай з’явы і яе сутнасных узаемадачыненняў, а таксама да актыўнага ўдзелу з боку навучэнцаў у педагагічным працэсе, фармавання адказнасці і самастойнасці. Новая інфармацыя прадстаўляецца не як ізаляваная, а як уключаная ў сістэму. Асноўнымі базіснымі элементамі сістэматызацыі ведаў у іх комплексным разглядзе называюць: аднолькавае і адрознае, прычыну і вынік, структуру і функцыі, цыклічнасць і ўплыў [3]. Акрамя таго выхоўваецца асоба ў цэлым – дасягаюцца не толькі акадэмічныя мэты педагагічнага працэсу, але фармуецца гарманічна развіты чалавек ва ўсіх накірунках яго дзейнасці.

3) адукацыя, заснаваная на традыцыйнай культуры (culture-based education) або адукацыя, адчувальная да традыцыйнай культуры (culture appropriate education), якая вызначае, што цэнтральнымі пытаннямі ў адукацыі з’яўляюцца асаблівасці культуры, мовы, кагнітыўных здольнасцяў, сацыяльнага жыцця і навыкаў камунікацыі. Асноўнымі прынцыпамі, якія адрозніваюць дадзены тып адукацыйнага працэсу, з’яўляюцца: сумесная праца навучэнца і выкладчыка, назіранне як асноўны метад навучання, праблемнасць заняткаў, дыялог замест лекцыі, адпаведнасць зместу навучання сучасным патрэбам супольнасці і навучэнца [1].

Сярод асноўных каштоўнасцяў, на якіх засноўваецца культура (у тым ліку і педагагічная) індзейцаў, выдзяляюць:

1) узаемасувязь (разуменне сувязі чалавека з прыродай, з іншымі людзьмі, з сусветам; разуменне сувязі ўсіх з’яў і падзей; разуменне сувязі этапаў чалавечага жыцця і г.д.); 2) гармонію (разуменне таго, што

дачыненні чалавека з наваколлем – прыродным, сацыяльным, а таксама сувязі самаго наваколля мусяць знаходзіцца ў гармоніі і балансе); 3) здаровы лад жыцця (які дазваляе падтрымліваць гарманічныя дачыненні паміж фізічна развітым целам і духоўна дасканалай душой); 4) духоўнасць (якая ўспрымаецца як неад'емная частка жыцця, такая ж патрэбная для душы, як фізічныя практыкаванні для цела; а таксама ў межах адукацыйнага працэсу развіццё маралі разглядаецца як доўгатэрміновая задача); 5) культурную ідэнтычнасць (якая праз каштоўнасці, традыцыю фармуе ядро асобы) [4]; 6) цыклічнасць (сімвалічнае разуменне развіцця чалавека, падзей, ходу часу праз вобраз кола); 7) талерантнасць (разуменне роўнасці людзей, грамадстваў, народаў, нацый, якія развіваюцца ў гуманістычным накірунку).

З усведамлення культурных адметнасцяў вынікаюць асноўныя аспекты мадэлі выхавання, якая накіраваная на фармаванне наступных каштоўнасцяў: прыналежнасці (усведамлення асобы ў яе ўзаемадачыненнях з наваколлем), дасягнення (арыентацыі на паспяховае выкананне пэўнай задачы), незалежнасці (фармавання адказнасці, самастойнасці, самадысцыпліны), шчодрасці (арыентацыі на карысць грамадства, а не на ўласнае ўзбагачэнне) [2].

Адметнасцю педагагічнага працэсу індзейцаў называюць своеасаблівы стыль навучання, які характэрызуецца наступным алгарытмам: назіранне, абдумванне, разуменне/адчуванне, дзеянне (выкананне) [3]. Прычым сцвярджаецца важнасць самастойнасці ў працэсе навучання, важнасць уласнага досведу. Любое выкананне задання ацэньваецца перш за ўсё пазітыўна, увага надаецца выкананаму, а не памылкам. Навучэнец жорстка не абмежаваны ў часе – ён вельмі часта сам вызначае час, калі можна прадставіць сваю працу на публічную ацэнку.

Такім чынам, гуманістычныя тэндэнцыі ў навучальна-выхаваўчым працэсе паўночна-амерыканскіх індзейцаў займаюць цэнтральнае месца і вызначаюць не толькі змест, але і метады, тэхналогіі, прыёмы адукацыйнага працэсу. У межах сучаснай педагогікі варта ўлічыць досвед індзейцаў, каб эфектыўна выхоўваць сапраўды годных, гарманічна і рознабакова развітых асоб, грамадзянаў і прафесіяналаў, у чым, па-сутнасці, і заключаецца мэта адукацыі і выхавання.

**Літаратура:**


1. *Demmert W. G.,* Jr. What is a culture-based education? Understanding Pedagogy and Curriculum // Honoring our heritage: culturally appropriate approaches for teaching indigenous students / Reyhner J., Gilbert W.S. Arizona: Flagstaff, AZ: Northern Arizona University. 2011. P.1-9.
2. *Jensen C.* Martin Brokenleg promotes Native American child-rearing philosophies for all children // An online Newsletter celebrating Native America [Electronic resource].

2001. Nov.3. issue 48. – Mode of access: http://www.turtletrack.org/Issues01/Co11032001/CO_11032001_ Childrearing.htm.
3. *Rhodes R.W.* Holistic teaching/learning for native American students // Journal of American Indian Education. 1988. Jan. N2. Vol.27. P.21-29.
4. *Tsai G.,* Alanis *L*. The native American culture: a historical and reflective perspective / G. Tsai, L. Alanis // NASP Communique [Electronic resource]. 2004. Mode of access: http://www.nasponline.org/publications/ cq/ cq 328native.aspx.